# СА СВЯТАМ КАСТРЫЧНІКА!

## УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

**Аб узнагароджанні Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэта імя У. І. Леніна Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР**

За поспехі ў развіцці вышэйшай адукацыі і навукі, падрыхтоўцы і выхаванні спецыялістаў для народнай гаспадаркі і культуры і ў сувязі з 50-годдзем з дня заснавання ўзнагародзіць Беларускі дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэт імя У. І. Леніна Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Ф. СУРГАНАЎ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Л. ЧАГІНА.

29 кастрычніка 1971 года, гор. Мінск.


ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 31 (826) ● Чацвер, 4 лістапада 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

**Мінск, Палац спорту. 1 лістапада 1971 года.** Прэзідыум урачыстага пасяджэння, прысвечанага 50-годдзю Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэта імя У. І. Леніна. На трыбуне—кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Беларусі **П. М. Машэраў.**

## БЕЛАРУСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА УНІВЕРСІТЭТУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі, Прэзідыум Вярхоўнага Савета і Савет Міністраў Беларускай ССР горача віншуюць прафесарска-выкладчыцкі састаў, студэнтаў, рабочых, служачых, увесь шматтысячны калектыў Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэта імя У. І. Леніна з 50-годдзем з дня заснавання універсітэта.

Стварэнне Беларускага дзяржаўнага універсітэта і станаўленне вышэйшай адукацыі ў Беларусі стала магчымым у выніку перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, паслядоўнага ажыццяўлення ленінскай нацыянальнай палітыкі КПСС.

Паўвекавы юбілей універсітэта—вялікая знамянальная падзея ў грамадска-палітычным жыцці беларускага народа. Створаны па ініцыятыве Уладзіміра Ільіча Леніна, Беларускі дзяржаўны універсітэт з'яўляецца прызнаным флагманам вышэйшай школы рэспублікі, цэнтрам падрыхтоўкі высококваліфікаваных нацыянальных кадраў. Больш чым 30 тысяч яго выпускнікоў плённа працуюць у самых розных галінах народнай гаспадаркі, культуры і навукі.

Беларускі дзяржаўны універсітэт цяпер з'яўляецца буйной навуковай установай. Яго вучоныя дабіліся значных вынікаў у вырашэнні актуальных навуковых праблем, іх дасягненні справядліва атрымалі шырокую вядомасць і прызнанне. На базе універсітэта і з яго дапамогай створаны многія вышэйшыя навучальныя ўстановы і навукова-даследчыя ўстановы Беларусі. Неацэнны яго ўклад у фарміраванне і развіццё нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зместу культуры беларускага народа. Універсітэт выхаваў плеяду таленавітых вучоных, пісьменнікаў, паэтаў, педагогаў. Многія яго выпускнікі сталі арганізатарамі народнай гаспадаркі і культуры, вядомымі партыйнымі, дзяржаўнымі і грамадскімі дзеячамі.

Камуністычная партыя і Савецкі ўрад высока ацанілі заслугі універсітэта ў падрыхтоўцы кадраў і ў развіцці навуковых даследаванняў, узнагародзіўшы яго ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і Ленінскай юбілейнай граматай у гонар 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна.

Змагаючыся за ажыццяўленне рашэнняў гістарычнага XXIV з'езда КПСС, прафесары і выкладчыкі, партыйная, камсамольская і прафсаюзная арганізацыі універсітэта настойліва і мэтанакіравана ўзбройваюць маладых спецыялістаў асновамі марксісцка-ленінскага вучэння, закладваюць у іх трывалы фундамент ведаў, фарміруюць уменне выкарыстоўваць іх на практыцы, выхоўваюць актыўных барацьбітоў за навукова-тэхнічны прагрэс, за ажыццяўленне планаў камуністычнага будаўніцтва. Паляпшаючы навуковую і практычную падрыхтоўку спецыялістаў, расшыраючы іх тэарэтычны і культурны кругагляд, удасканальваючы арганізацыю навуковых даследаванняў, універсітэта ўносіць дастойны ўклад ва ўсенародны рух за хутчэйшае выкананне заданняў дзевятай пяцігодкі.

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі, Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР, Савет Міністраў Беларускай ССР выказваюць цвёрдую ўпэўненасць у тым, што прафесары і выкладчыкі, партыйная і грамадскія арганізацыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, кіруючыся рашэннямі XXIV з'езда КПСС і ўказаннямі, выкладзенымі ў выступленні Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева на Усесаюзным злёце студэнтаў, будуць яшчэ з большай настойлівасцю змагацца за павышэнне навукова-тэарэтычнага ўзроўню падрыхтоўкі студэнтаў і аспірантаў, творча ўдасканальваць навучальны працэс і развіваць навуковыя даследаванні, выхоўваць юнакоў і дзяўчат у духу марксісцка-ленінскага светапогляду, камуністычнай перакананасці, класавай самасвядомасці, непрымірымасці да любых праяўленняў буржуазнай ідэалогіі, бязмежнай любві і адданасці сваёй вялікай сацыялістычнай Радзіме.

Ва ўрачысты дзень 50-годдзя і ўзнагароджання універсітэта Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР жадаем калектыву БДУ новых вялікіх поспехаў у ганаровай і высакароднай справе падрыхтоўкі ідэйна стойкіх, высококваліфікаваных спецыялістаў, у далейшым развіцці навукі і культуры Савецкай Беларусі.

**ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ**

**ПРЭЗІДЫУМ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР**

**САВЕТ МІНІСТРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР**

Свята Вялікага Кастрычніка супала сёлета для універсітэцкага калектыву з юбілейнымі ўрачыстасцямі. У гэтыя дні універсітэт рапартуе Камуністычнай партыі, ураду, роднаму народу аб здзяйсненнях сваёй 50-гадовай гісторыі, пачатак якой паклала Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя. Дзякуючы ёй, вызваліўшай Беларусь ад прыгнёту, няроўнасці, дзякуючы празорлівай ленінскай нацыянальнай палітыцы стаў магчымым такі буйны росквіт навукі, культуры, мастацтва, якога дасягнула Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка і ўвасабленнем якога з'яўляецца наш універсітэт.

І сёння, рыхтуючыся да свята Вялікага Кастрычніка, мы горача ўслаўляем сваю многанацыянальную Радзіму, забяспечыўшую шчасце і росквіт усіх савецкіх народаў.

**З УЗНАГАРОДАЙ!**

**За поспехі ў развіцці вышэйшай адукацыі і навукі, падрыхтоўцы і выхаванні спецыялістаў для народнай гаспадаркі і ў сувязі з 50-годдзем з дня заснавання Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэта імя У. І. Леніна ўзнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР 61 і Граматай Вярхоўнага Савета БССР 82 работнікі БДУ.**

## СВЯТА НАВУКІ І КУЛЬТУРЫ

У святочным убранні карпусы Беларускага дзяржаўнага універсітэта. На вуліцах і плошчах Мінска —лозунгі і транспаранты. Працоўныя сталіцы рэспублікі разам з усім беларускім народам урачыста адзначаюць паўвекавы юбілей флагмана вышэйшай школы — Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Святкаванне праходзіць у знамянальныя дні, калі навучэнская моладзь краіны жыве пад уражаннем нядаўна прайшоўшага ў сталіцы нашай Радзімы Усесаюзнага злёту студэнтаў, яркай прамовы на ім Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева.

З глыбокім усведамленнем сваёй высакароднай місіі ў развіцці эканомікі і культуры краіны, з пачуццём высокай адказнасці перад Радзімай, рашучасцю аддаць усе свае веды і энергію савецкаму народу, вялікім ідэалам камунізму прыйшлі 1 лістапада прафесары, выкладчыкі і студэнты універсітэта ў Мінскі Палац спорту, дзе адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны паўвекавому юбілею ВНУ.

На віншаванне юбіляра сабраліся прадстаўнікі партыйных, савецкіх, камсамольскіх органаў, грамадскіх арганізацый, вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. Прыбылі дэлегацыі універсітэтаў Масквы, Ленінграда, Казані і іншых гарадоў краіны, зарубежныя госці.

Месцы за сталом прэзідыума займаюць П. М. Машэраў, Ф. А. Сурганаў, Ц. Я. Кісялёў, А. Н. Аксёнаў, А. Т. Кузьмін, І. Я. Палякоў, М. Н. Полазаў, І. М. Траццяк, У. І. Падрэз, М. І. Лагір, міністр вышэйшай і

*(Заканчэнне на 2-й стар.).*

## ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА ПРЭЗІДЫУМУ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА САЮЗА САВЕЦКІХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК САВЕТУ МІНІСТРАЎ САЮЗА ССР

Мы, удзельнікі ўрачыстага сходу, прысвечанага 50-годдзю Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, ад імя шматтысячнага калектыву студэнтаў, прафесарска-выкладчыцкага саставу, рабочых і служачых старэйшай ВНУ рэспублікі звяртаемся да роднай Камуністычнай партыі, яе ленінскага Цэнтральнага Камітэта, Савецкага ўрада са словамі гарачага прывітання, глыбокай любві і сардэчнай удзячнасці за іх вялікія клопаты аб Беларусі, развіцці яе эканомікі, культуры, навукі.

Паўвекавы юбілей нашага універсітэта—гэта радаснае свята ўсяго беларускага народа, свята росквіту яго нацыянальнай сацыялістычнай культуры, гэта—яшчэ адно сведчанне трыумфу справы Вялікага Кастрычніка, трыумфа ленінскай нацыянальнай палітыкі Камуністычнай партыі, дабратворнага ўплыву дружбы і брацтва савецкіх народаў.

Створаны ў 1921 годзе ў адпаведнасці з дэкрэтам вялікага Леніна першы ў гісторыі беларускага народа універсітэт стаў сапраўднаю калыскай яго навукі і культуры, кузняй высокакваліфікаваных кадраў многіх галін ведаў. За 50 гадоў сваёй дзейнасці універсітэт даў рэспубліцы, яе заводам і будоўлям, лабараторыям і навукова-даследчым інстытутам, школам і установам культуры, партыйным і грамадскім арганізацыям звыш трыццаці тысяч сваіх выпускнікоў, якія шчодра аддаюць веды і вопыт, талент і здольнасці свайму народу, справе будаўніцтва сацыялізму і камунізму. Значны ўклад нашых вучоных у развіццё важнейшых напрамкаў сучаснай навукі, распрацоўку актуальных праблем прыродазнаўства і грамадазнаўства.

Сённяшні БДУ—адна з буйнейшых ВНУ нашай краіны. Яна па-ранейшаму застаецца флагманам беларускай навукі і культуры. 18 тысяч навучэнцаў, звыш 1.700 выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў, сярод якіх больш 500 дактароў і кандыдатаў навук, 14 факультэтаў, 91 кафедра, цудоўныя лабараторыі і кабінеты, якія забяспечаны навейшым абсталяваннем,—такое сучаснае аблічча нашага універсітэта, такое адно са сведчанняў пастаянна растучых клопатаў нашай партыі, Савецкага ўрада аб развіцці навукі і культуры беларускага народа, усёй нашай краіны.

Новым пацвярджэннем гэтага, праяўленнем клопатаў партыі аб студэнцтве, аб умацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы ВНУ і тэхнікумаў з'яўляецца толькі што апублікаваная пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму паляпшэнню матэрыяльных і жыллёва-бытавых умоў студэнтаў вышэйшых і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў».

Мы поўныя пачуцця глыбокай падзякі партыі і ўраду за тую высокую ацэнку, якую яны далі працоўнаму ўкладу калектыву універсітэта ў здзяйсненні задач камуністычнага будаўніцтва, удастоіўшы яго ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга, узнагародзіўшы БДУ Ленінскай Юбілейнай граматай, устаноўленай для пераможцаў у спаборніцтве ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Высокая ацэнка сціплай працы нашага калектыву, нястомныя клопаты аб далейшым развіцці і росквіце Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна выклікаюць жаданне і імкненне кожнага з нас працаваць яшчэ больш упарта і настойліва, пастаянна паляпшаць і ўдасканальваць усю сістэму падрыхтоўкі і выхавання будучых спецыялістаў, авалодваць ведамі, садзейнічаць далейшаму развіццю навукі. Мы разумеем, што гэтым унясём свой уклад у рашэнне тых грандыёзных задач, якія паставіў перад нашай краінай XXIV з'езд КПСС, выклікаўшы ў студэнтаў, супрацоўнікаў, выкладчыкаў і прафесараў БДУ, як і ва ўсіх савецкіх людзей, новы прыліў энергіі, бадзёрасці, рэвалюцыйнага энтузіязму. Як баявую праграму дзеянняў успрымаем мы задачы, пастаўленыя ў прамове Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева на нядаўна закончыўшымся Усесаюзным злёце студэнтаў.

Мы ўрачыста завяраем родную Камуністычную партыю, ленінскі Цэнтральны Камітэт КПСС, Прэзідыум Вярхоўнага Савета і Савет Міністраў СССР, што наш шматтысячны калектыў аддасць усе свае веды, уменні і старанні, не пашкадуе сіл і энергіі ў барацьбе за здзяйсненне задач камуністычнага будаўніцтва.

Няхай жыве Камуністычная партыя Савецкага Саюза і яе ленінскі Цэнтральны Камітэт!

Няхай жыве перадавая савецкая навука!

Няхай жыве камунізм!

# СВЯТА НАВУКІ І КУЛЬТУРЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР В. П. Ялюцін, загадчык сектара аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПСС Ф. І. Далгіх, Старшыня Вярхоўнага Савета БССР І. П. Шамякін, намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР І. Ф. Клімаў, намеснікі Старшыні Савета Міністраў БССР П. Л. Коханаў, Н. Л. Сняжкова, загадчыкі аддзелаў ЦК КПБ А. Ц. Караткевіч і С. В. Марцэлеў, міністры Беларускай ССР, прэзідэнт Акадэміі навук БССР М. А. Барысевіч, былы выпускнік універсітэта — акадэмік-сакратар аддзялення фізіка-матэматычных навук АН СССР Л. А. Арцымовіч, кіраўнікі дэлегацый універсітэтаў, якія прыбылі на юбілейныя ўрачыстасці: Маскоўскага імя М. В. Ламаносава — прарэктар В. І. Тропін, Ленінградскага імя А. А. Жданава — прарэктар В. Н. Філіпаў, Варшаўскага (ПНР) —прарэктар Уладзіслаў Радзевальд, Люблянскага (СФРЮ) — рэктар Мірын Грудзен, Ягелонскага (ПНР) — прарэктар Здзіслаў Опяль, Кіеўскага — прафесар А. З. Жмудскі, Казанскага — прафесар Э. М. Ахунзянаў, Алма-Ацінскага — прафесар К. А. Аханаў, Тбіліскага—прарэктар С. М. Джарбенадзе, Азербайджанскага — прарэктар А. Г. Агаева, Вільнюскага — рэктар І. П. Кубілюс, Латвійскага — прарэктар С. К. Граўжэніс, Ерэванскага — прарэктар К. Э. Хачатуран, прадстаўнікі Савецкай Арміі, грамадскасці, прафесары, выкладчыкі і студэнты Беларускага універсітэта.

Урачысты сход адкрыла намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. Л Сняжкова.

— Дарагія таварышы, паважаныя госці! — гаворыць яна. — Беларускаму ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнаму універсітэту імя У. І. Леніна споўнілася 50 гадоў. Як вялікае свята ў культурным жыцці рэспублікі, свята навукі і вышэйшай школы, адзначаюць гэту дату працоўныя Беларусі.

Юбілей універсітэта— гэта свята вялікага прафесарска-выкладчыцкага калектыву, які з вышыні 50-гадовай гісторыі выразна бачыць вынікі сваёй высакароднай справы, гэта свята тысяч і тысяч юнакоў і дзяўчат рэспублікі, якім універсітэт адкрывае перспектывы будучыні, ідэйна загартоўвае, узбагачае ведамі, дае спецыяльнасць, гэта свята ветэранаў універсітэта, тых, хто прымаў удзел у яго стварэнні, вучыўся і працаваў ва універсітэце ў розныя гады яго дзейнасці, хто закладваў і ўзбагачаў яго слаўныя традыцыі.

У падрыхтоўцы да юбілею, абагульненні матэрыялаў яго гісторыі разам з цяперашнім калектывам універсітэта самы актыўны ўдзел прымалі ветэраны і, у прыватнасці, група першых яго студэнтаў, тых, хто ў 1925 годзе атрымаў першыя дыпломы першай навучальнай установы рэспублікі.

Юбілей універсітэта — гэта свята і яго шматлікіх сяброў, тых, каго звязвае з Беларускім дзяржаўным універсітэтам трывалая дружба і плённае супрацоўніцтва.

Н. Л. Сняжкова цёпла вітала гасцей, якія прыбылі на юбілей універсітэта.

Выконваюцца дзяржаўныя гімны Савецкага Саюза і Беларускай ССР.

Пад гукі маршу ў залу ўносяцца сцягі універсітэта.

Прысутныя з вялікім уздымам выбіраюць ганаровы прэзідыум сходу ў саставе Палітбюро ЦК КПСС.

Слова атрымлівае кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў.

***

Пад бурныя апладысменты прысутных тав. П. М. Машэраў уручыў Ганаровую грамату Вярхоўнага Савета БССР, якой узнагароджаны Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна за поспехі ў развіцці вышэйшай адукацыі і навукі, падрыхтоўцы і выхаванні спецыялістаў для народнай гаспадаркі і ў сувязі з 50-годдзем з дня яго заснавання. Узнагароду прымаюць рэктар універсітэта акадэмік АН БССР, Герой Сацыялістычнай Працы, прафесар А. Н. Сеўчанка, сакратар парткома М. К. Гарбачоў, старшыня мясцовага камітэта В. Ф. Чыгір, сакратар камітэта камсамола В. І. Пракошын і студэнтка філалагічнага факультэта Т. Жук.

Тав. П. М. Машэраў зачытаў прывітальнае пісьмо ЦК Кампартыі Беларусі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і Савета Міністраў БССР Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту імя У. І. Леніна. Удзельнікі сходу сустрэлі прывітанне бурнымі апладысментамі.

З дакладам аб 50-годдзі універсітэта выступіў рэктар А. Н. Сеўчанка.

Юбіляра цёпла вітаў міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР В. П. Ялюцін.

— Цяжка пераацаніць ролю, якую адыграў БДУ імя У. І. Леніна ў жыцці беларускага народа,— сказаў у сваёй прамове прэзідэнт АН БССР М. А. Барысевіч. — Ён з'яўляецца сапраўднай кузняй кадраў для прамысловасці, сельскай гаспадаркі, культуры і навукі. У Акадэміі навук Беларусі плённа працуюць больш чым дзве тысячы яго выхаванцаў. Многія з іх праславілі савецкую навуку, імі ганарыцца беларускі народ.

М. А. Барысевіч пажадаў калектыву старэйшай ВНУ новых поспехаў у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, вялікіх дасягненняў у развіцці навукі, якія будуць садзейнічаць паспяховаму ажыццяўленню рашэнняў XXIV з'езда КПСС.

Удзельнікаў урачыстага сходу прыйшлі вітаць прадстаўнікі рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў Мінска.

— Паўвекавы юбілей універсітэта, — гаворыць дэпутат Вярхоўнага Савета БССР Л. І. Дрозд, — гэта вялікае свята рабочага класа, усяго беларускага народа. БДУ імя У. І. Леніна даў фабрыкам і заводам рэспублікі тысячы спецыялістаў, якія дапамагаюць нам павышаць прадукцыйнасць працы, павялічваць выпуск прадукцыі, дабівацца эканоміі сродкаў і матэрыялаў.

Рабочы клас, разгарнуўшы сацыялістычнае спаборніцтва, пачаў выкананне планаў дзевятай пяцігодкі, якая яшчэ больш умацуе эканоміку і абаронную магутнасць Радзімы, павысіць матэрыяльны дабрабыт працоўных. Многія рабочыя нашага завода вучацца ва універсітэце. Я з радасцю паведамляю іх прафесарам і выкладчыкам, што ўсе яны з'яўляюцца добрымі работнікамі вытворчасці і грамадскімі работнікамі, прыкладам для сваіх таварышаў.

На трыбуне — прарэктар Маскоўскага ордэна Леніна і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава В. І. Тропін. Ён сардэчна павіншаваў сваіх беларускіх калег са святам.

— БДУ імя У. І. Леніна,— падкрэсліў ён, — займае асаблівае месца ў жыцці беларускага народа. З ім звязана станаўленне і развіццё ўсёй вышэйшай школы рэспублікі.

Прамоўца выказаў пажаданне калектыву універсітэта дабівацца новых поспехаў у выхаванні і падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, стойкіх марксістаў-ленінцаў, вялікіх дасягненняў у навуковых даследаваннях на карысць Савецкай Радзімы.

На сцэну падымаюцца прадстаўнікі працаўнікоў сельскай гаспадаркі з каравaем хлеба, спечанага са збожжа ўраджаю першага года дзевятай пяцігодкі. На расшытым беларускім ручніку яны падносяць гэты дар рэктару універсітэта. Са словамі прывітання выступае старшыня калгаса імя Чкалава Салігорскага раёна А. І. Дубоўскі, былы выпускнік універсітэта.

— Беларускі універсітэт, —сказаў у сваім выступленні міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкоў,— дастойна выконвае ганаровую місію падрыхтоўкі спецыялістаў. І сёння наш народ выказвае глыбокую ўдзячнасць яго прафесарам і выкладчыкам за ўклад, які ўносяць яны ў развіццё культуры і адукацыі. Няма сумнення, што прафесары і выкладчыкі універсітэта ўзнімуць на яшчэ больш высокую ступень методыку і выхаваўчую работу, дабіюцца новых поспехаў у падрыхтоўцы і выхаванні кваліфікаваных спецыялістаў.

Ад імя інтэлігенцыі рэспублікі юбіляраў цёпла вітаў народны паэт БССР П. У. Броўка. Ён расказаў аб пісьменніках і паэтах — выпускніках ВНУ, прачытаў верш, прысвечаны юбілею універсітэта.

Аб слаўных справах камсамольцаў БДУ імя У. І. Леніна расказаў першы сакратар ЦК ЛКСМБ У. І. Падрэз.

— Камсамольская ячэйка універсітэта, якая 50 гадоў назад налічвала ўсяго 40 камсамольцаў,—сказаў ён,— выросла ў 10-тысячную арганізацыю. Сваім баявым запалам, маладой энергіяй яна ўносіць жывы струмень у жыццё студэнтаў.

Удзельнікаў урачыстага сходу сардэчна павіншавалі таксама прарэктар Ленінградскага універсітэта В. Н. Філіпаў, акадэмік-сакратар аддзялення фізіка-матэматычных навук АН СССР былы выпускнік Беларускага універсітэта Л. А. Арцымовіч, прарэктар Кіеўскага універсітэта А. З. Жмудскі, прафесар Казанскага універсітэта Э. М. Ахунзянаў, прарэктар Ягелонскага універсітэта (ПНР) Здзіслаў Опяль, прафесар Алма-Ацінскага універсітэта К. А. Аханаў, рэктар Люблянскага універсітэта (СФРЮ) Мірын Грудзен, прарэктар Варшаўскага універсітэта (ПНР) Уладзіслаў Радзевальд, прарэктар Тбіліскага універсітэта С. М. Джарбенадзе, прарэктар Азербайджанскага універсітэта А. Г. Агаева, рэктар Вільнюскага універсітэта І. П. Кубілюс, прарэктар Латвійскага універсітэта С. К. Граўжэніс, прарэктар Ерэванскага універсітэта К. Э. Хачатуран.

Ад імя калектываў сваіх універсітэтаў прамоўцы цёпла і сардэчна віталі юбіляра, выказалі яму пажаданні новых поспехаў у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў і навуковай дзейнасці.

Слова ўдзячнасці Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі і Савецкаму ўраду за бацькоўскія клопаты аб навучэнскай моладзі выказала студэнтка IV курса філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна Таццяна Жук.

— Савецкае студэнцтва заўсёды было, ёсць і будзе верным памочнікам партыі,— сказала яна.— Мы— прадаўжальнікі слаўных рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцый бацькоў і дзядоў. Мы клянёмся быць дастойнымі пераемнікамі старэйшага пакалення будаўнікоў камунізму.

Зачытваюцца шматлікія віншавальныя тэлеграмы і адрасы, якія паступілі ва універсітэт з усіх канцоў краіны.

Удзельнікі ўрачыстага сходу аднадушна прынялі тэкст прывітальнага пісьма Цэнтральнаму Камітэту КПСС, Прэзідыуму Вярхоўнага Савета СССР і Савету Міністраў СССР.

У заключэнне для ўдзельнікаў урачыстага сходу быў дадзен вялікі канцэрт.

(БЕЛТА).

# З УЗНАГАРОДАЙ, ТАВАРЫШЫ!

## *УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР*

### АБ ПРЫСВАЕННІ ГАНАРОВЫХ ЗВАННЯЎ НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫМ РАБОТНІКАМ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

За вялікія поспехі ў развіцці навукі, падрыхтоўцы і выхаванні спецыялістаў для народнай гаспадаркі прысвоіць ганаровыя званні

**Заслужанага дзеяча навукі Беларускай ССР**

**Булахаву** Міхаілу Гапеевічу — загадчыку кафедры рускай мовы.

**Валадзько** Леаніду Вікенцьевічу — прарэктару па навуковай рабоце.

**Жыдовіч** Марыі Андрэеўне — прафесару кафедры беларускай мовы.

**Лушчыцкаму** Івану Мікалаевічу — загадчыку кафедры гісторыі філасофіі і логікі.

**Сікорскаму** Усеваладу Міхайлавічу — загадчыку кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў.

**Заслужанага работніка вышэйшай школы Беларускай ССР**

**Малышаву** Андрэю Якаўлевічу — прарэктару па навучальнай рабоце.

**Заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі Беларускай ССР**

**Вафіядзі** Уладзіміру Гаўрылавічу — загадчыку кафедры электрафізікі.

**Заслужанага юрыста Беларускай ССР**

**Цішкевічу** Івану Станіслававічу — загадчыку кафедры крымінальнага права.

**Чыгіру** Васілю Фёдаравічу — загадчыку кафедры грамадзянскага права і працэсу.

**Заслужанага настаўніка Беларускай ССР**

**Умрэйку** Сцяпану Андрэевічу — прарэктару па вучэбнай рабоце.

**Заслужанага дзеяча фізічнай культуры Беларускай ССР**

**Фефелаву** Віталію Мікалаевічу — выконваючаму абавязкі загадчыка кафедры фізічнага выхавання і спорту.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Ф. СУРГАНАЎ.**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Л. ЧАГІНА.**

29 кастрычніка 1971 года, гор. Мінск.

# БЕЛАРУСЬ, ЯК СВЯТА, АДЗНАЧАЕ ТВОЙ ЮБІЛЕЙ, НАШ РОДНЫ БДУ

## ДОБРАЕ СЛОВА АБ УНІВЕРСІТЭЦЕ

У актавай зале БДУ 30 кастрычніка адбылося ўрачыстае расшыранае пасяджэнне вучонага савета універсітэта. Яго адкрыў прарэктар універсітэта прафесар А. Я. Малышаў. Ён сардэчна прывітаў у сценах універсітэта шматлікіх гасцей—прадстаўнікоў партыйных, савецкіх, прафсаюзных, камсамольскіх арганізацый, прадпрыемстваў, будоўляў, вышэйшых навучальных устаноў Мінска і Беларусі, дэлегацыі з братніх рэспублік і зарубежных краін.

З дакладам выступіў рэктар БДУ, акадэмік АН БССР, Герой Сацыялістычнай Працы прафесар А. Н. Сеўчанка. Ён расказаў аб гісторыі стварэння ВНУ і яго паўвекавым шляху, вучобе шматтысячнага калектыву студэнтаў, рабоце прафесараў і выкладчыкаў.

Юбіляра цёпла павіншаваў з вялікім святам ад імя Мінскага абкома і гаркома КПБ, Мінскага аблвыканкома і гарадскога Савета дэпутатаў працоўных сакратар абкома КПБ У. С. Багданаў.

Універсітэт павіншавалі сакратар Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў М. Л. Дубкова, член Ваеннага савета ЧБВА — начальнік Палітычнага ўпраўлення генерал-лейтэнант А. В. Дэбалюк, рэктар Гомельскага універсітэта, член-карэспандэнт АН БССР прафесар В. А. Белы, міністр сельскай гаспадаркі БССР, акадэмік АН БССР С. Г. Скарапанаў, дырэктар Інстытута матэматыкі АН БССР, акадэмік АН БССР, Герой Сацыялістычнай Працы М. П. Яруцін, дырэктар Мінскага аўтамабільнага завода І. М. Дзёмін, дырэктар Мінскай вышэйшай партыйнай школы Н. І. Пахомаў, дырэктар Інстытута фізікі АН БССР, акадэмік АН БССР Б. І. Сцяпанаў, старшыня прэзідыума праўлення Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі Г. Г. Чарнушчанка, прадстаўнікі Міністэрства прамысловага будаўніцтва БССР, інстытутаў Акадэміі навук БССР, Мінскага камвольнага камбіната, трактарнага завода, камбіната «Беларускалій», Дзяржаўнага аптычнага інстытута імя С. І. Вавілава, рэдакцыі газеты «Звязда», ВНУ, даследчых устаноў, прадпрыемстваў.

Са словамі падзякі за падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў і віншаваннямі да юбіляраў звярнулася дэлегацыя замежных студэнтаў, якія вучацца ва універсітэце. Студэнты з В'етнама, ГДР, Балгарыі, Афганістана, афрыканскіх краін выказалі сваю гарачую ўдзячнасць прафесарам і выкладчыкам, таварышам па вучобе— савецкім студэнтам.

Ад імя прафесараў, выкладчыкаў. і студэнтаў Іенскага універсітэта імя Шылера выступіў рэктар гэтай навучальнай установы прафесар Франц Больк, які адзначыў вялікае значэнне сувязі паміж Іенскім і Беларускім універсітэтамі для развіцця вышэйшай школы ГДР. Ён паднёс прысвечаны 50-годдзю Белдзяржуніверсітэта зборнік сумесных навуковых прац вучоных БДУ і Іены.

На ўрачыстым пасяджэнні вучонага савета былі ўручаны шматлікія прывітальныя адрасы і падарункі. На імя універсітэта паступіла вялікая колькасць віншавальных тэлеграм, прыйшло многа пісем ад былых выхаванцаў гэтай ВНУ, вучоных з гарадоў Беларусі і Савецкага Саюза.

У заключным слове рэктар універсітэта А. Н. Сеўчанка выказаў гарачую ўдзячнасць усім калектывам, арганізацыям, ВНУ, якія павіншавалі БДУ з яго вялікім святам.

Ва ўрачыстым расшыраным пасяджэнні вучонага савета БДУ прынялі ўдзел намеснік старшыні Савета Міністраў БССР Н. Л. Сняжкова, намеснік загадчыка аддзела навукі і вышэйшых навучальных устаноў ЦК КПБ Я. М. Бабосаў, міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкоў, член прэзідыума АН СССР, акадэмік-сакратар аддзялення агульнай фізікі і астраноміі акадэмік Л. А. Арцымовіч, дэлегацыі савецкіх ВНУ і зарубежных вышэйшых навучальных устаноў, якія прыбылі на святкаванне 50-годдзя БДУ.

(БЕЛТА).

## ШЛЯХ, ПРОЙДЗЕНЫ РАЗАМ

Да ліку найбольш буйных бібліятэк, народжаных Кастрычнікам, адносіцца бібліятэка нашага універсітэта. Роля яе, як і любой бібліятэкі ВНУ, не абмяжоўваецца абслугоўваннем студэнтаў, хоць гэта адна з асноўных яе задач. Сёння бібліятэка БДУ — навуковы і метадычны цэнтр. Асновай для гэтага служаць багатыя фонды літаратуры па розных галінах ведаў. Яна карыстаецца папулярнасцю і павагай у навуковым і студэнцкім калектывах універсітэта і за яго межамі.

У юбілейныя для універсітэта дні нельга не ўспомніць шлях, пройдзены яго бібліятэкай. Яна была заснавана напярэдадні 4-й гадавіны Кастрычніка (30 кастрычніка 1921 года). А 15 верасня 1922 года рэарганізавана ў аб'яднаную Беларускую дзяржаўную і універсітэцкую бібліятэку. Гэта дата з'яўляецца датай утварэння Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна. Адкрыццё ж адзінай рэспубліканскай і універсітэцкай бібліятэкі адбылося ў маі 1922 года. У 1926 годзе Дзяржаўная бібліятэка БССР вылучылася ў самастойную ўстанову, але працягвала выконваць функцыі фундаментальнай бібліятэкі БДУ аж да 1930 года. Адначасова за кошт дублетных фондаў былі арганізаваны факультэцкія і кафедральныя бібліятэкі, якія працягвалі ў далейшым камплектавацца непасрэдна універсітэтам. Пасля арганізацыі на базе Белдзяржуніверсітэта раду галіновых ВНУ (педагагічнай, медыцынскай, народнай гаспадаркі і інш.) гэтыя факультэцкія бібліятэкі адышлі да адпаведных ВНУ.

Фонд бібліятэкі БДУ да пачатку Вялікай Айчыннай вайны дасягнуў 200 тысяч тамоў. У час акупацыі Беларусі нямецка-фашысцкія захопнікі разбурылі універсітэт і яго бібліятэку.

Другое нараджэнне бібліятэкі пачалося ў 1943 годзе на станцыі Сходня пад Масквой, дзе аднавілася дзейнасць універсітэта. Вялася інтэнсіўная работа і па стварэнню кніжнага фонду. Да звароту ў Мінск фонд налічваў каля 20 тысяч тамоў. У цяжкіх ваенных і пасляваенных умовах, без аціяплення, у непрыстасаваным памяшканні бібліятэка пачала абслугоўваць студэнтаў і навуковых работнікаў. Нашы старыя чытачы помняць, як цесна, цёмна і няўтульна было ў адзінай невялікай чытальнай зале.

Цяпер бібліятэка абслугоўвае 20 тысяч чытачоў, выдае ў год 1.400.000 экземпляраў кніг і часопісаў. Штодзённа абанемент і чытальныя залы наведваюць 2.400 чалавек, паступае ў бібліятэку штодня 150—200 кніг і часопісаў. У фондзе налічваецца 1 мільён 50 тысяч тамоў літаратуры.

Усе гэтыя гады самаадданая працуе невялікі калектыў бібліятэкі. Удасканальваліся метады і формы абслугоўвання чытачоў, ствараліся каталогі і картатэкі, развівалася бібліяграфічная, масавая, інфармацыйная работа, вялася шырокая прапаганда кнігі.

Пастаяннае імкненне наперад, заваяванне ўсё новых пазіцый, імкненне паўней задаволіць запатрабаванні чытачоў дазволіла універсітэцкай бібліятэцы вырасці ў буйную ўстанову з рознабаковай дзейнасцю.

Зроблена многа, але многа яшчэ трэба ўдасканальваць, укараняць, а часам і выпраўляць.

Падводзячы вынікі 50-годдзя, мы ў той жа час павінны не толькі аглядацца назад, але і сур'ёзна падумаць аб перспектывах нашага далейшага развіцця, каб з гонарам выканаць задачу, пастаўленую перад вышэйшай школай XXIV з'ездам КПСС.

У святочныя дні жадаю бібліятэцы, яе нястомнаму калектыву таго, што звычайна жадаюць юбілярам: вечнай маладосці, новых поспехаў і светлых перспектыў! Нашым чытачам, студэнтам і пачынаючым сваё ўзыходжанне да вышынь навукі жадаю быць вернымі сябрамі і цаніцелямі нашай цудоўнай бібліятэкі, гатовай раскрыць перад імі свае кніжныя багацці.

**Р. ЛЮБІНА.**



## ПАМЯЦЬ ПАДКАЗВАЕ

Я закончыў фізіка-тэхнічнае аддзяленне педфака БДУ сорак год таму назад. Мой выпуск, здаецца, шосты. Усе, нават самыя звычайныя факты далёкага мінулага, страчваюць празаічны «жыцейскі» прысмак і становяцца падчас нават рамантычнымі. Таму трэба з піэтэтам адносіцца да таго, што нас акружае цяпер: усе станоўчыя факты — гэта старажытнасць у перспектыве. Універсітэт канца 20-х гадоў — яго духоўная атмасфера, універсітэцкае «паветра», калектыў — гэта тэма для вялікай «педагагічнай паэмы».

Я з вялікай павагай і ўдзячнасцю ўспамінаю нашага рэктара У. І. Пічэту і сваіх настаўнікаў — прафесара Я. Я. Сіроціна, Я. В. Сняткова, У. К. Дыдырка, Ц. Л. Бурстына. Сваёй натхнёнай працай са студэнтамі, сваім майстэрствам выкладання, сваёй прысутнасцю, сваёй грамадзянска-чалавечнай асобай яны ўрываліся ў духоўны свет сваіх вучняў, супрацоўнікаў па кафедры, выклікалі імкненне быць падобнымі на іх. Я не магу не сказаць аб адным шчаслівым дары маіх настаўнікаў — яны былі вельмі добрымі і чулымі людзьмі. Такога роду талент не так ужо багата запраграмираваны ў нашым спадчынным кодзе.

Цяжка назваць другога прафесара, які б умеў так проста і непасрэдна, як гэта рабіў прафесар С. Я. Вальфсон, які чытаў курс марксісцка-ленінскай філасофіі, прымусіць вас быць саўдзельнікам пошукаў навуковай ісціны. Нельга не ўспомніць добрым словам нашых сяброў-студэнтаў — актывістаў, такіх, як старшыня пралетстуда тав. Башмачнікаў. Гэта дзякуючы іх намаганням нам пашчаслівілася бачыць і слухаць А. В. Луначарскага, У. У. Маякоўскага.

Выступленні гэтых вядомых людзей мелі вялікі ўплыў, удасканальвалі этыку, эстэтыку і маральны воблік студэнта майго часу.

У сцены нашай дарагой альма-матэр ужо ўвайшлі ўнукі майго пакалення. Мы пастарэлі. Але мілы нашаму сэрцу універсітэт, калыска навукі і вышэйшай адукацыі ў рэспубліцы, малады, расце, набіраючы ўсё большую моц і сілу.

У дні слаўнага юбілею я нізка-нізка кланяюся табе, універсітэт, і жадаю табе ўсяго самага добрага.

**М. РЭЗНІКАЎ,**
дацэнт.

## НАСТАЎНІЦА І БАЕЦ

«Без ваганняў Лідзія Нілаўна выкінула дзве вінтоўкі да сябе ў двор і тут жа вылезла сама. Усё гэта яна рабіла спакойна, не спяшаючыся. Не ўпершыню забіралася сюды. То гранат набярэ, то патронаў. Гітлераўцы іх ніколі не лічылі... Калі нават прыйдуць правяраць, то знойдуць у тайніку бочку з капустай. Зброя праз паўгадзіны будзе дастаўлена ў атрад». Гэты ўрывак узят з аповесці В. Сіманавай «Мы будзем жыць», і гаворыцца ў ім пра Лідзію Нілаўну Шастакову з Астрашыцкага Гарадка Мінскага раёна. У час гітлераўскай акупацыі гэта мужная жанчына забяспечвала партызан зброяй і боепрыпасамі, харчамі, медыкаментамі, адзеннем.

Лідзія Нілаўна Шастакова—гераіня аповесці «Мы будзем жыць» — закончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт у 1936 годзе. Разам з мужам, таксама выхаванцам універсітэта, Кірылам Іванавічам (загінуў у 1944 годзе і таксама герой гэтай аповесці) прыехала настаўнічаць у невялікае мястэчка Астрашыцкі Гарадок. У сярэдняй школе Лідзія Нілаўна выкладала біялогію каля 30 гадоў. З захапленнем працавала з вучнямі на прышкольным участку, вывела з юннатамі новыя гатункі раслін.

Цяпер Лідзія Нілаўна Шастакова на пенсіі, але яе настаўніцкую справу працягвае дачка Святлана.

**М. ВОЙЦЕНКАЎ.**

## НАС ВІНШУЮЦЬ

*У дні юбілею універсітэцкая пошта стала яшчэ больш разнастайнай і вялікай: пісьмы, паштоўкі, тэлеграмы прыходзяць з усіх куткоў нашай Радзімы і з замежных краін. Нас віншуюць са святам калектывы навучальных устаноў, былыя студэнты і супрацоўнікі БДУ. Публікуем радкі з пісьмаў святочнай пошты.*

Ад імя настаўнікаў і работнікаў народнай асветы сардэчна віншую прафесарска-выкладчыцкі састаў, студэнтаў універсітэта са слаўным юбілеем. Жадаю шматтысячнаму калектыву далейшых поспехаў у справе навучання і камуністычнага выхавання маладога пакалення.

**Міністр ПРАКОФ'ЕЎ.**

**Дарагія таварышы!**

**Пяцьдзесят год БДУ — вялікае свята для ўсіх, хто вучыўся і вучыцца ў яго сценах. Я на ўсё жыццё ўдзячны прафесарам і выкладчыкам яго, якія ў асноўным узброілі мяне ведамі і навучылі, як самастойна здабываць іх.**

**Часта ўспамінаю наш дружны студэнцкі калектыў, які сумесна пераадольваў цяжкасці ў набыцці навукі, а было ж нам нялёгка. Шмат было нас, якім даводзілася, мінаючы сярэднюю школу, у сучасным разуменні, брацца за вышэйшую асвету. Але вялікае жаданне і ўпартасць перамаглі.**

**Зайздрошчу вам, хто сёння здабывае веды ў БДУ імя У. І. Леніна. Усё пайшло наперад. Больш шматгранныя веды адкрыліся вам і больш шматграннае жыццё для прымянення іх.**

**Вялікага вам поспеху, маладыя сябры!**

**Пятрусь БРОЎКА,**
**лаўрэат Ленінскай прэміі,**
**народны паэт БССР.**

# НАС ВІНШУЮЦЬ

Дарагія настаўнікі, хто вучыў нас жыць, дарагія наступнікі, хто заняў нашы месцы на універсітэцкіх лаўках, віншую вас з залатым юбілеем нашага універсітэта.

Шырокага вам неба, высокага палёту! І няхай на самай высокай вышыні будзе чуцен вам голас бацькоўскай зямлі, яе роднае слова!

**В. ПАЛТАРАН,**
**пісьменніца, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР.**

Дэкану К. К. Герману.

Перш за ўсё я хацеў бы павіншаваць вас і ўсіх супрацоўнікаў нашага факультэта з вялікім святам — 50-годдзем Беларускага універсітэта і 54-й гадавінай Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Я цяпер далёка ад любімага Савецкага Саюза і горада Мінска, але самыя добрыя ўспаміны жывуць у маім сэрцы. Беларусь і Беларускі універсітэт дарагімі і роднымі сталі мне таму, што я там жыў і вучыўся 8 год. Гэта гады маёй маладосці, гады студэнцтва і аспірантуры.

Зараз я — супрацоўнік кафедры тэарэтычнай фізікі Ханойскага універсітэта. На кафедры працуе 14 супрацоўнікаў, дзевяць з іх — выпускнікі савецкіх вну, сярод іх 4 кандыдаты навук.

У радах выкладчыкаў працуюць і іншыя выпускнікі Беларускага універсітэта: Нгуен Ван Хунг, Нгуен Ч'еу Ту, былы аспірант Дзінг Ван Хоанг і стажор Нгуен Конг Туй. Выхаванцы БДУ працуюць у розных інстытутах і міністэрствах маёй радзімы. Хоанг Дзінь Зунг — у інстытуце матэматыкі, Кхонг Дзінь Хонг — у педагагічным, До Лінг Кыонг — ва ўпраўленні хіміі і г. д.

Карыстаючыся выпадкам, я хацеў бы выразіць вам шчырую падзяку за вялікую дапамогу ў маёй вучобе і жыцці.

З павагай Нгуен Ван ТХОА.
Ханой, кастрычнік 1971 года.

У праблемнай лабараторыі біялагічнага факультэта. Фота Д. Чаховіча.



Вядуць даследаванні з дапамогай электроннага мікраскопа малодшы навуковы супрацоўнік А. М. Баранаў і студэнт І. Міроненка.

Фота Д. Чаховіча.

## ДЗЕНЬ МАЛАДОГА ЛЕКТАРА

У гонар 50-годдзя БДУ студэнты V курса юрыдычнага факультэта, якія праходзяць спецыялізацыю па крымінальна-прававому цыклу, выступілі з лекцыямі перад вучнямі старшых класаў у школах №№ 1, 41, 52, 56, 71, 74, 75, 101, 110 г. Мінска. Усяго ў гэты дзень было прачытана 43 лекцыі. Выступленні студэнтаў спадабаліся школьнікам. Водгукі аб лекцыях атрыманы станоўчыя. Студэнты — таксама задаволены. Яны замацавалі матэрыял, што вывучалі на занятках, набылі навыкі прававой прапаганды, якія ім будуць так неабходны праз паўгода ў самастойнай працы.

Такія станоўчыя формы спалучэння вучобы з практычнай дзейнасцю варта пашыраць сярод студэнтаў іншых факультэтаў.

**А. ПРЫМАЧОНАК,**
**намеснік сакратара партбюро юрыдычнага факультэта.**

# ПАЭТА ВОБРАЗНАЕ СЛОВА

У некаторых групах вячэрняга філфака сталі традыцыйнымі сустрэчы студэнтаў з беларускімі пісьменнікамі. Нядаўна адбылася яшчэ адна такая сустрэча. На гэты раз студэнты VI курса аддзялення рускай мовы і літаратуры і студэнты II курса беларускай мовы і літаратуры сустрэліся з доктарам філалагічных навук прафесарам нашага універсітэта беларускім паэтам Алегам Антонавічам Лойкам.

Спачатку дацэнт В. П. Рагойша пазнаёміў прысутных з жыццёвым і творчым шляхам паэта. Затым Алег Антонавіч расказаў аб сваіх творчых падарожжах па Беларусі, цікавых сустрэчах, падзяліўся планамі, прачытаў новыя творы.

З творчасцю гэтага беларускага паэта мы, вядома, былі знаёмы. Аднак, пачуўшы вершы з вуснаў самога Алега Антонавіча, сталі разумець іх неяк па-іншаму. Яны нібы напоўніліся новымі колерамі і гукамі. Перад вачыма паўсталі краявіды роднай Беларусі:

І туліцца да вёскі вёска,
Як пацеркі на нітцы рэчкі,
А сіняя лясоў палоска
Зліваецца з нябес далечай.
Пяшчотна, з ледзь-ледзь прыкметным гумарам загаварылі маладосць і каханне:
Каторы ўжо раз закаханы
У цябе я — дзесяты, соты?..
Перахоплівае дыханне,
Як ты парушаеш самоту.
Строга і стрымана загучалі роздумы аб чалавеку, яго думках і справах, адносінах да жыцця:
І мне наканаваны бой,
...Бой з тупасцю, як пень, тупой,
Бой з чэрствасцю, як час, скупой,
Бой з крывадушнасцю любой,
Бяскроўны, ды смяротны бой.
Вельмі радасна, што гэты цудоўны беларускі паэт і буйны літаратуразнаўца яшчэ і настаўнік, выкладчык, прафесар.

**Т. АЛЬФЯРОВІЧ,**
**студэнтка II курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.**

## У СТУДЭНЦКІМ ВЫЛІЧАЛЬНЫМ

У мінулым годзе на аддзяленні радыёфізікі фізічнага факультэта быў створан вылічальны цэнтр. Зараз тут працуюць у асноўным студэнты чацвёртага курса, але заглядваюць сюды і прымаюць удзел у справах ВЦ студэнты трэцяга курса і другакурснікі. Пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў кафедры ЭММ студэнты выкарыстоўваюць электронна-вылічальную машыну пры выкананні курсавых, дыпломных і навукова-даследчых работ. У недалёкім будучым студэнцкі вылічальны цэнтр будзе выконваць работы па дагаворах з прадпрыемствамі і арганізацыямі.

А пачыналася ўсё са стварэння гуртка. Узнік ён у 1968 годзе і аб'яднаў 15 зацікаўленых вылічальнай тэхнікай студэнтаў. Юнакам прачыталі некалькі лекцый па вылічальнай тэхніцы, азнаёмілі з прынцыпамі работы машын. Сярод першых быў і Уладзімір Куцэнка, цяпер студэнт чацвёртага курса і староста групы, што працуе з машынай.

Нядаўна, як паведаміла супрацоўнік кафедры ЭММ Маргарыта Уладзіміраўна Мішурная, ішла размова аб заключэнні дагавору са студэнцкім вылічальным цэнтрам. І, відаць, хутка будучых радыёфізікаў чакае адказная, але цікавая праца ва гаспадарчых дагаворах.

**Л. ПАНІХІНА.**

# ЯЕ ЗАХАПЛЕННЕ

У спорце перамагаюць моцныя воляй. Студэнтку IV курса аддзялення радыёфізікі, майстра спорту па гімнастыцы Тамару Яфрэменка я адношу менавіта да такіх людзей.

Тамара Лазаковіч, Святлана Маскалёва... З імёнамі гэтых дзяўчат звязаны ўспаміны аб занятках у Віцебскай дзіцячай спартыўнай школе. Усіх трох аб'ядноўвала агульнае захапленне гімнастыкай. Сустрэча з былымі сяброўкамі заўсёды сапраўднае свята для Тамары. Чамусьці тады ўспамінаецца адзін выпадак з яе спартыўнага жыцця.

...Летнія трэніроўкі. Спякота. Адны думкі аб тым, каб збегчы як-небудзь на рэчку. Займацца не хочацца. Трэнер загадвае пакінуць залу. Выйшла... і нават уздыхнула з палёгкай. А потым пашкадавала аб сваім учынку. Праз некалькі дзён зноў вярнулася.

А калі б не?

Не бачыць бы табе, Тома, ні звання майстра спорту, ні Спартакіяды народаў СССР.

— Але не ў тытулах справа, — гаворыць Тамара. — Гэта, сапраўды, вельмі праўдзівыя словы: «Галоўнае, перамагчы самога сябе».

Дзяўчаты, што жывуць з Тамарай у інтэрнаце, расказваюць:

— Як пойдзе ў 8 гадзін раніцы, дык і прыйдзе вечарам.

Інакш не выходзіць. Колькі разоў яна разважала аб тым, што стала галоўным у жыцці. Радыёфізіка і гімнастыка... Кожны студэнцкі дзень аддае яна гэтым дзвюм «каралевам». Адна палова дня — гэта лекцыі, заняткі ў лабараторыі. Другая — трэніроўкі.

Тамара лічыць, што трэба вельмі сур'ёзна займацца, каб стаць добрым спецыялістам. Аднаго ведання тэорыі мала. Таму яе і хвалюе будучая практыка.

«А вось як быць з гімнастыкай»? — на трэцім курсе паўстала і перад ёй, як і перад многімі студэнтамі, пытанне.

На секцыі хадзіць не абавязкова. Тваё права і жаданне. Ды толькі не змагла развітацца Тамара са сваім захапленнем.

— Адвыкаеш ад снарада хутка, — гаворыць яна. — І калі ў мінулым годзе не было трэнера, хадзіла на трэніроўкі ў фізкультурны інстытут.

У гэтым годзе наша каманда папоўнілася першакурсніцамі: прыйшлі Матузава Зіна, Леташкова Ніна. Пяць разоў у тыдзень займаецца з намі трэнер Ігар Васільевіч Пазновіч. Працаваць даводзіцца многа. І я згодна з думкай Люды Турышчавай: «Трэба настройвацца на барацьбу са снарадам, а не з саперніцамі».

Шчырая і добрая да людзей Тамара. Хто за парадай ці проста за канспектамі, за дапамогай звяртаюцца да яе аднакурснікі.

А як знак майстэрства гімнасткі Тамары Яфрэменка — яе спартыўныя ўзнагароды: медаль за ўдзел у Спартакіядзе горада і рэспублікі, кубак Белсавета «Буравеснік», дыпломы і граматы.

**Л. КАЗІМІРСКАЯ.**

# ПАВЕРЦЕ, АТРЫМАЕЦЦА

*Гумарэска*

«Ну што за пасіўныя студэнты ў нашай групе! У мастацкі музей, на выстаўку ці прагулку за горад не выцягнуць. Не ведаюць дарогі ні ў адну спартыўную секцыю. Не паважаюць вечароў адпачынку. Адным словам, нейкія інертныя!..»

Вам не даводзілася чуць такіх слоў ад групкамсорга? Паверце, чулі, і не раз.

А я не згодзен. Чаму?

Уявіце сабе такую сцэнку. Да канца лекцыі яшчэ пяць-сем хвілін, а ажыўленасць у аўдыторыі расце. За апошнімі сталамі ўжо варушацца студэнты, збіраюць у папкі кнігі, сшыткі. Хтосьці слёзна ўпрошвае лектара: «Адпусціце, калі ласка, маці першы раз у Мінск прыязджае. Трэба сустрэць».

Другі напамінае: «Чаму нас трымаюць тут? Званок зараз...» А група ўжо «на старце». Правая рука сагнута ў локці (справа дзверы). Левая (штуршковая) трымае папку. Корпус у напружанні і накіраван уперад. Усе глядзяць на лектара з надзеяй, чакаюць. І вось яно: «Можаце быць свабоднымі».

Быццам лавіна з гары, кідаюцца да выхаду студэнты. Дзесьці ў сярэдзіне гэтай лавіны рухаюся і я. Незнарок наступаю на нейчую нагу, і вось ужо раздаецца: «Мядзведзь»! Хлопец у шэрым пінжаку настойліва пхне мяне на спіну ў белым світары, над якой узвышаецца гара валос (ніяк не магу разабрацца, ён гэта ці яна). Адчуўшы небяспеку, фігура лоўка адыходзіць. Разам з групай студэнтаў вылятаю на калідор і з палёгкай уздыхаю. Штосьці падобнае я назіраў сёння ў тралейбусе, калі ехаў на лекцыі.

А ў калідоры стаіць шум: хтосьці поўзае па падлозе і шукае гузік ад свайго пінжака. Дзяўчына ў светлай кашулі раптам заўважае чужы шалік на сваёй шыі. «Чаму чужы? Чый шалік? Дзе мой?» — пытаецца яна. Але няма часу наводзіць спраўкі, трэба вырашаць усё хутка. Бо не яна, дык хто-небудзь іншы ўціснецца ў паліто і паімчыць на вуліцу.

...І хоць не было патрэбы несціся стрымгалоў: ёсць яшчэ справы ва універсітэце — пазаймацца ў чытальнай зале або выпусціць чарговы нумар насценгазеты, — вас не пакідае ўзбуджэнне ад таго, што гонка выйграна.

Думаецца, што не грэх і самім актывістам прыняць удзел у такіх спаборніцтвах. І калі студэнты рынуцца на вуліцу — вось тут і час працягваць гонку—на лыжню, на бегавую дарожку, па турысцкай сцяжынцы.

Паверце мне, атрымаецца выдатны вынік.

**У. СКУЛЬБЕДАЎ.**

## ПАПРАЎКА

У папярэднім нумары нашай газеты (за 30 кастрычніка 1971 г.) дапушчана памылка. На 2-й старонцы ў матэрыяле «Народжаны Кастрычнікам» першы абзац трэба чытаць: «...і астраноміі АН СССР Л. А. Арцымовіч, народны паэт Беларусі акадэмік АН БССР П. У. Броўка, прэзідэнт Акадэміі навук БССР акадэмік М. А. Барысевіч...» і далей па тэксту.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 15220 Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Зак. 1319.